Слова для Жыцця (88)

Аўтар: Рэдакцыя
22.03.2015 01:00



Папа Францішак

У перыяд Вялікага посту мы рыхтуемся да цэлебрацыі Вялікадня (Пасхі), падчас якой мы адновім свае хросныя абяцанні. Вандруючы па гэтым свеце, як Езус, і робячы з нашага існавання знак Яго любові да братоў, асабліва самых слабых і самых бедных, мы будуем святыню Бога ў нашым жыцці. Так мы можам многім людзям, якіх спаткалі на сваім шляху, даць магчымасць сустрэчы з Езусам. Але запытайма саміх сябе, ці сапраўды Бог адчувае сябе ў нашым жыцці, як дома? Ці дазваляем мы Яму “навесці парадак” у нашых сэрцах і выкінуць бажкоў (нашы пэўныя паставы і да т.п.), якія, магчыма, глыбока ўкараніліся ў нас?

Кожная Эўхарыстыя, якую мы цэлебруем з верай, прыводзіць да таго, што мы ўзрастаем як жывая святыня Пана, праз камунію з Яго Целам, укрыжаваным і ўваскрослым. Езус ведае, што ёсць у кожным з нас, і ведае таксама наша самае гарачае жаданне – жаданне, каб Ён у нас пасяліўся, толькі Ён.

Анёл Панскі са Святым Айцом, 08.03.2015 †

Слова для Жыцця (88)

Аўтар: Рэдакцыя
22.03.2015 01:00

